Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар
УА «Беларускі дзяржаўны
ўніверсітэт культуры і мастацтваў»
______________ В. М. Міхееў
«____»_____________ 2013 г.
Рэгістрацыйны № ВД-_____ /вуч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# АГУЛЬНАЕ МОВАЗНАЎСТВА

*Вучэбная праграма*
*па спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (па напрамках), напрамку спецыяльнасці 1-23 01 11-04 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (філалогія і лінгвістыка), спецыялізацыі 1-23 01 11-04 01 Беларуская мова і літаратура*

Мінск
БДУКМ
2013

**СКЛАДАЛЬНІК**

*І. П. Клімаў,* дацэнт кафедры беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат філалагічных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*А. А. Кожынава,* прафесар кафедры тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны універсітэт», доктар філалагічных навук, прафесар;

*А. А. Жалуновіч,* загадчык кафедры рускай мовы як замежнай установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат філалагічных навук, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

*кафедрай* беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 10 ад 21.06.2012 г.);

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 1 ад 24.09.2012 г.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: І. П. Клімаў

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Дысцыпліна «Агульнае мовазнаўства» прызначана студэнтам спецыяльнасці «бібліятэказнаўства і бібліяграфія» з дадатковай спецыялізацыяй «беларуская мова і літаратура», якія вывучаюць агульныя і спецыяльныя дысцыпліны філалагічнага цыкла на беларускай мове. Спецыфіка дысцыпліны заключаецца ў яе інтэграцыйнасці. Згодна з вучэбным планам у студэнтаў указанай спецыяльнасці адсутнічае дысцыпліна «Уводзіны ў мовазнаўства», якая знаёміць з асноўнымі паняццямі і тэрмінамі лінгвістыкі. Таму дадзеная дысцыпліна сумяшчае тэарэтычныя веды як «Уводзін у мовазнаўства», так і «Агульнага мовазнаўства» пры пэўнай генералізацыі дэталяў апошняй. Разам з тым улічвалася і магчымасць замацаваць і паглыбіць веды па тэорыі мовы, атрыманыя студэнтамі на занятках па іншых філалагічных дысцыплінах.

*Мэта* дысцыпліны – стварэнне ў студэнтаў базы ведаў па тэорыі мовы і лінгвістычнай метадалогіі.

Асноўнымі *задачамі* дысцыпліны з’яўляюцца:

– паглыбленне і замацаванне існуючых і новых ведаў студэнтаў па тэорыі мовы і асноўных раздзелах мовазнаўства;

– авалоданне лінгвістычнай тэрміналогіяй і паняццевым апаратам, а таксама асноўнымі метадамі аналізу моўных фактаў;

– выпрацоўка навуковага погляду на факты мовы і праявы нарматыўнасці ў мове;

– замацаванне навыкаў самастойнага аналізу моўных фактаў і іх суаднясення з адпаведнай лінгвістычнай і экстралінгвістычнай сітуацыяй;

– праца з навуковымі тэкстамі лінгвістычнага характару.

У праграму дысцыпліны ўвайшлі найважнейшыя палажэнні тэарэтычнага мовазнаўства, сфармуляваныя з улікам апошніх дасягненняў навуковай думкі. Праграма складзена такім чынам, каб разгледзець на занятках найбольш важны і істотны матэрыял, перш за ўсё тэарэтычны. Наяўнасць літаратуры па тэорыі мовы дазваляе выносіць многія тэмы дысцыпліны, добра асветленыя ў спецыяльнай літаратуры, для самастойнай працы студэнтаў. Спіс такой літаратуры дазволіць студэнтам рыхтавацца да семінарскіх заняткаў і да заліку, праводзіць самастойную працу і арыентавацца ў асноўных кірунках развіцця

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мовазнаўства і ў яго найважнейшай праблематыцы. Праверка атрыманых ведаў з дапамогай заліку завяршае этап засваення матэрыялу.

У выніку вывучэння дысцыпліны «Агульнае мовазнаўства» студэнты павінны *ведаць*:

– змест і аб’ём паняцця «мовазнаўства»;

– асноўныя раздзелы і часткі сучаснага мовазнаўства;

– асноўную тэрміналогію сучаснага мовазнаўства, яго паняццевую базу;

– асноўныя кірункі і перспектывы развіцця сучаснага мовазнаўства;

– асноўныя канцэпцыі і тэорыі сучаснага мовазнаўства;

– метадалогію сучаснага мовазнаўства.

На базе атрыманых ведаў у выніку вывучэння дысцыпліны «Агульнае мовазнаўства» студэнты павінны *ўмець:*

– арыентавацца ў асобных лінгвістычных дысцыплінах і раздзелах мовазнаўства;

– арыентавацца ў праблематыцы сучаснага мовазнаўства, у тым ліку ў актуальнай лінгвістычнай літаратуры;

– карыстацца лексікаграфічнай, даведачнай і бібліяграфічнай літаратурай па мовазнаўстве;

– правільна карыстацца тэрміналогіяй і паняццевым апаратам лінгвістыкі;

– правільна аналізаваць моўныя факты на падставе той ці іншай метадалогіі і тэорыі.

Важнай умовай засваення студэнтамі дысцыпліны «Агульнае мовазнаўства» з’яўляецца ўлік ведаў і ўменняў па іншых дысцыплінах філалагічнага цыкла, перш за ўсё такіх, як «Сучасная беларуская мова», «Гісторыя беларускай мовы», «Лінгвістычны аналіз тэксту», «Асновы культуры мовы і стылістыкі», «Методыка выкладання беларускай мовы і літаратуры». Не варта забывацца і на матэрыял іншых гуманітарных дысцыплін – літаратуразнаўства, культуралогіі, гісторыі, фальклору і інш. Ён дапаможа студэнтам разабрацца ў асобных пытаннях, узбагаціць свае веды патрэбнымі фактамі і звесткамі.

Пры вывучэнні дысцыпліны «Агульнае мовазнаўства» рэкамендуецца выкарыстоўваць разнастайныя тэхналогіі навучання. Выкарыстанне відэа- і аўдыясродкаў паспрыяе рацыянальнаму размеркаванню вучэбнага часу і забяспечыць доўгатэрміновае засваенне матэрыялу. Некаторыя тэмы мэтазгодна рэка-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мендаваць для самастойнага вывучэння, прычым выкладчык павінен арыентаваць студэнтаў на пошук не толькі вучэбнай, але і навуковай літаратуры, дакладна акрэсліўшы мэты і задачы даследчай працы студэнтаў.

Вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны «Агульнае мовазнаўства» прадугледжана 70 гадзін, з якіх 40 гадзін – аўдыторныя (28 гадзін – лекцыі, 12 гадзін – семінарскія заняткі). Рэкамендаваная форма кантролю – залік. Самастойную працу студэнтаў рэкамендуецца праводзіць у выглядзе апытання на семінарскіх занятках і на заліку, а па асобных пытаннях – у выглядзе рэфератаў ці дакладаў, якія заслухоўваць на занятках.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Раздзелы і тэмы | Колькасць аўдыт. гадзін | | |
|---|---|---|---|
| | усяго | лекцыі | семін. |
| ***Уводзіны*** | 2 | 1 | 1 |
| **Раздзел I. Прырода мовы, яе суадносіны з камунікацыяй і мысленнем** | | | |
| *Тэма 1.* Камунікацыя і сутнасць мовы | 2 | 2 | |
| *Тэма 2.* Мова і мысленне. Моўная карціна свету | 2 | 2 | |
| **Раздзел II. Семіятычная канцэпцыя мовы** | | | |
| *Тэма 3.* Мова як знакавая сістэма | 2 | 2 | |
| **Раздзел III. Структура мовы** | | | |
| *Тэма 4.* Фанетыка | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 5.* Фанеміка | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 6.* Марфеміка і словаўтварэнне | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 7.* Лексікалогія. Слова і семасіялогія. Фразеалогія | 3 | 2 | 1 |
| *Тэма 8.* Лексічная сістэма мовы. Аб'ём слоўніка мовы | 3 | 2 | 1 |
| *Тэма 9.* Граматыка і марфалогія | 3 | 2 | 1 |
| *Тэма 10.* Сінтаксіс | 3 | 2 | 1 |
| *Тэма 11.* Структурная тыпалогія моў і лінгвістыка ўніверсалій | 2 | 2 | |
| **Раздзел IV. Сацыяльная лінгвістыка і пісьмо** | | | |
| *Тэма 12.* Сацыяльная лінгвістыка | 3 | 2 | 1 |
| *Тэма 13.* Пісьмо. Графіка і арфаграфія | 1 | 1 | |
| **Раздзел V. Дыяхранічная лінгвістыка** | | | |
| *Тэма 14.* Дыяхранічная лінгвістыка | 2 | 2 | |
| **Разам...** | 40 | 28 | 12 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

## *Уводзіны*

Прадмет і задачы мовазнаўства. Структура мовазнаўства: агульнае і прыватнае, сінхроннае і дыяхроннае, унутранае і знешняе, тэарэтычнае і прыкладное. Асноўныя лінгвістычныя дысцыпліны. Метадалогія і метады мовазнаўства. Месца мовазнаўства сярод навук пра чалавека і грамадства. Выкарыстанне набыткаў мовазнаўства.

Асноўныя этапы развіцця мовазнаўства. Веды і ўяўленні пра мову ў старажытнасці і ў Сярэднявеччы. Узмацненне ўвагі да мовы ў эпоху Рэнесансу, класіцызму, Асветніцтва. Асноўныя кірункі развіцця мовазнаўства ў XIX–XX стст.: дыяхранічная лінгвістыка, арэальная лінгвістыка і лінгвагеаграфія, тыпалагічная класіфікацыя, псіхалінгвістыка, сацыялінгвістыка, лінгвакультуралогія і этналінгвістыка, лінгвістычная філасофія, кагнітывістыка. Структуралізм як канцэпцыя мовы і як лінгвістычная метадалогія. Асноўныя кірункі структуралізму: функцыянальная лінгвістыка (пражская школа), гласематыка, амерыканская дэскрыптывістыка. Роля семіётыкі.

## Раздзел I. Прырода мовы, яе суадносіны з камунікацыяй і мысленнем

### *Тэма 1. Камунікацыя і сутнасць мовы*

Камунікацыя і спосабы перадачы інфармацыі. Тэкст, метатэкст. Кампаненты камунікатыўнага акта (размоўца, адрасат, змест зносін, мэта выказвання, маўленчы і сітуацыйны кантэкст, узаемаадносіны паміж камунікантамі).

Працэс камунікацыі (інтэракцыя). Камунікатыўная кампетэнцыя камунікантаў. Прэсупазіцыі. Імплікатуры. Прынцып кааперацыі. Камунікатыўныя няўдачы.

Мова і маўленне. Адрозненне мовы і маўлення. Маўленчая дзейнасць. Ролі ў маўленчай дзейнасці (сацыяльныя (статусныя), пазіцыйныя, сітуацыйныя). Функцыі мовы і маўлення (камунікатыўная, кагнітыўная, рэгулятыўная, эмацыянальная, фатычная, метамоўная, эстэтычная). Адносіны мовы і маўлення да нормы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 2. Мова і мысленне. Моўная карціна свету*

Суадносіны вербальнага (моўнага) і вобразнага мыслення. Мова як інструмент думкі. Адзінства і адрозненне мовы і мыслення. Псіхафізіялагічная (мазгавая) арганізацыя маўленчай дзейнасці. Паталогія маўлення. Працэс спараджэння і ўспрымання маўлення, іх сувязь. Асацыятыўныя слоўнікі і іх прызначэнне.

Роля мовы ў адлюстраванні навакольнага свету. Моўная карціна свету і яе антрапаморфны характар. Моўныя значэнні і канцэпты. Лексічныя лакуны і безэквівалентная лексіка. Нацыянальна-культурная спецыфіка маўлення. Тэорыя лінгвістычнага рэлятывізму (гіпотэза Сепіра-Ворфа). Міфалагізацыя слоў. Эўфемізмы і табу.

## Раздзел II. Семіятычная канцэпцыя мовы

### *Тэма 3. Мова як знакавая сістэма*

Семіётыка як навука аб знаках, яе прадмет і задачы. Знак і два яго планы (зместу і выражэння). Пытанне аб адвольнасці моўнага знака і неканвенцыйныя адносіны да знака (у дзяцей, рэлігіі, паэзіі і г.д.). Асноўныя ўласцівасці моўнага знака. Тыпы знакаў (індэксы (сімптомы), іконы (копіі), сімвалы). Субзнакі (фігуры, дыстынктары, экспаненты).

Чатыры аспекты плана зместу знака: сігматыка (дэнатат), парадыгматыка (семантыка), сінтагматыка, прагматыка.

Адзінкі мовы і моўныя ўзроўні, падставы іх вылучэння. Аднаўзроўневыя і шматузроўневыя семіётыкі. Паняцце аб моўнай сістэме, узроўневая будова мовы. Своеасаблівасць асобных узроўняў мовы. Адносіны паміж моўнымі адзінкамі ў сістэме, праявы міжузроўневага ізамарфізму.

Значэнне семіётыкі для лінгвістыкі і тэорыі камунікацыі. Знакавы характар захавання і перадачы інфармацыі ў грамадстве і прыродзе. Падставы класіфікацыі знакавых сістэм (біялагічныя і культурныя, натуральныя і штучныя).

## Раздзел III. Структура мовы

### *Тэма 4. Фанетыка*

Апісальная (сінхранічная) і гістарычная (дыяхранічная) фаналогія. Гукі мовы як фізічная з’ява. Моўны апарат і яго бу-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дова. Артыкуляцыя і яе фазы. Асноўная класіфікацыя гукаў: акустычная і артыкуляцыйная. Дадатковая артыкуляцыя. Дыфтонгі, трыфтонгі, глайды. Афрыкаты.

Змены гукаў у моўнай плыні: рэдукцыя, акамадацыя, асіміляцыя, дысіміляцыя. Спантанныя змены гукаў: метатэза, дыэрэза, эпентэза, пратэза, гаплалогія, сінгарманізм.

Фанетычныя адзінкі гутаркі: гук, склад, такт, фраза. Складападзел і яго тэорыі. Тыпы складоў. Кліза. Прасадычныя з'явы (націск і інтанацыя). Роля паўзы.

Сістэма сегментных (фанетыка-фаналагічных ці складовых) і супрасегментных (акцэнталагічных і інтанацыйных) сродкаў мовы.

### *Тэма 5. Фанеміка*

Паняцце аб фанеме, суадносіны фанемы і гука. Варыянт і інварыянт фанемы. Дыферэнцыяльныя і інтэгральныя прыкметы фанем. Апазіцыі фанем і сістэма фанем. Моцныя і слабыя пазіцыі фанем. Нейтралізацыя фанем у слабых пазіцыях. Паняцце аб гіперфанеме. Тыпы дыстрыбуцыі гукаў. Змены гукаў: пазіцыйныя, камбінаторныя, гістарычныя.

Тэорыя апазіцый М. Трубяцкога і яе значэнне для даследавання фаналогіі і іншых узроўняў мовы. Прыватыўныя, эквіпалентныя і градуальныя апазіцыі. Прыватыўныя апазіцыі ў фаналогіі, узаемаадносіны іх маркіраваных і немаркіраваных членаў. Устойлівасць і дынамічнасць фаналагічнай сістэмы, яе простасць і складанасць.

### *Тэма 6. Марфеміка і словаўтварэнне*

Паняцце аб марфеме. Варыянт і інварыянт марфемы. Асноўныя ўласцівасці марфем. Адрозненні ад фанемы і лексемы. Прынцыпы класіфікацыі марфем. Тыпы марфем паводле адносін да структуры слова, маніфестацыі і функцыі. Класы марфем. Варыянтнасць, сінанімія, полісемія і аманімія марфем. Змены марфемнага складу ў ходзе развіцця мовы.

Марфаналогія і марфанемы. Адрозненне паміж словазмяненнем і словаўтварэннем. Словаўтварэнне як сістэма спосабаў вытворчасці слоў і сістэма словаўтваральных мадэляў.

Своеасаблівасць словаўтваральнага значэння. Словаўтваральная матывацыя: утваральная база і вытворнае. Аснова слова (вытворная і невытворная, утваральная і ўтвараючая) і фар-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мант. Словаўтваральная пара, ланцужок, гняздо. Словаўтваральны тып (мадэль). Асноўныя спосабы словаўтварэння. Кампазіты. Канверсія і капрэсія. Абрэвіяцыя.

### *Тэма 7. Лексікалогія. Слова і семасіялогія. Фразеалогія*

Прадмет і задачы лексікалогіі. Асноўныя яе раздзелы: семасіялогія, анамастыка, лексікаграфія.

Сутнасць слова, праблема яго дэфініцыі. Суадносіны слова з прадметам і паняццем. Значэнне слова, яго кампаненты. Імёны і тэрміны. Онімы (тапонімы і антрапонімы) і апелятывы. Тыпы слоў (самастойныя і службовыя; пазначэнні і выклічнікі).

Тыпы лексічных значэнняў: прамое, пераноснае, фразеалагічна звязанае, сінтаксічна абумоўленае значэнні. Значэнне слова і кантэкст. Канатацыя як частка прагматыкі слова. Полісемія (шматзначнасць), яе адрозненне ад аманіміі. Асноўныя тыпы пераносу значэнняў: метафара, метанімія, сінекдаха.

Намінацыя, прынцыпы намінацыі фрагментаў рэчаіснасці. Унутраная форма слова, матывацыя вытворных і невытворных слоў. Катахрэза. Этымалогія слова, дээтымалагізацыя, народная і паэтычная этымалогія.

Фразеалогія як асобны раздзел мовазнаўства, яе адрозненне ад афарыстыкі. Фразеалогія як узровень намінатыўных адзінак – фразем. Уласцівасці фразем: устойлівасць і ідэаматычнасць. Тыпы фразем.

### *Тэма 8. Лексічная сістэма мовы. Аб'ём слоўніка мовы*

Сістэмны характар лексікі. Падсістэмы лексічнай сістэмы: часціны мовы, лексіка-тэматычныя групоўкі слоў, словаўтваральныя групоўкі слоў (словаўтваральныя гнёзды). Лексіка-семантычныя групоўкі слоў. Сінонімы і іх тыпы (семантычныя, стылістычныя, абсалютныя, кантэкстуальныя). Сінанімічныя рады. Антонімы. Энантыясемія. Амонімы і іх тыпы (поўныя амонімы і амаформы; амафоны; амографы). Паранамазія. Гіперанімічна-гіпанімічныя адносіны ў лексіцы. Гетэронімы. Меронімы.

Паняцце аб слоўнікавым складзе мовы. Аб'ём слоўніка мовы і асобы. Падставы для класіфікацыі лексікі. Сацыяльна-тэрытарыяльная класіфікацыя лексікі. Класіфікацыя лексікі паводле паходжання. Класіфікацыя лексікі паводле частаты ўжытку і храналагічных суадносін. Стылявая класіфікацыя лексікі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Лексікаграфія як навука аб тэорыі і практыцы складання слоўнікаў. Слоўнік як даведачная кніга. Змест і структура слоўнікавага артыкула. Прынцыпы класіфікацыі і тыпы слоўнікаў.

### *Тэма 9. Граматыка і марфалогія*

Аб'ект і задачы граматыкі, яе структура. Граматычнае значэнне, яго адрозненне ад лексічнага. Спосабы выражэння граматычнага значэння. Тыпы граматычных значэнняў. Паняцце аб грамеме – элементарным граматычным значэнні. Тыпы грамем (словазмяняльныя і класіфікацыйныя, сінтаксічныя (рэляцыйныя) і несінтаксічныя, унутрымоўныя і пазамоўныя).

Граматычная форма слова (сінтэтычная і аналітычная). Марфалагічная тыпалогія. Сінтэтычныя і аналітычныя мовы. Фузія і аглюцінацыя як розныя віды афіксацыі. Ізаляваныя (каранёвыя), фузійныя (пранікальныя), аглюцінацыйныя (дакладальныя), інкарпаруючыя (полісінтэзуючыя) мовы. Граматычная катэгорыя. Асноўныя тыпы граматычных катэгорый у розных мовах свету.

Паняцце аб парадыгме, яе тыпы. Часціны мовы, прынцыпы іх вылучэння і размежавання. Транспазіцыя.

### *Тэма 10. Сінтаксіс*

Сінтаксічная функцыя, сувязь і валентнасць. Асноўныя тыпы сінтаксічных сувязяў. Спосабы (сродкі) сінтаксічных сувязяў.

Свабоднае, звязанае і сінтаксічна несвабоднае словазлучэнне. Суадносіны словазлучэння з формай слова і сказам. Асноўныя мадэлі словазлучэнняў у мовах свету.

Сказ, яго асноўныя ўласцівасці. Суадносіны сказа з выказваннем і суджэннем. Актуальны падзел сказа. Парадак слоў у сказе. Структурная схема сказа і яе кампаненты ў лагічным, семантычным і граматычным аспектах. Звышфразавыя адзінствы і лінгвістыка тэксту. Прэдыкатыўнасць, яе асноўныя характарыстыкі. Вербацэнтрычныя канцэпцыі сказа: прэдыкатна-аргументная структура. Класіфікацыя сказаў паводле мэты выказвання, мадальнасці і структуры. Паратаксіс і гіпатаксіс. Дыятэза. Намінатыўная, эргатыўная і актыўная будовы моў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 11. Структурная тыпалогія моў і лінгвістыка ўніверсалій*

Прадмет і задачы лінгвістычнай тыпалогіі. Суадносіны генеалагічнай і тыпалагічнай класіфікацыі моў. Фактары генетычнага, арэальнага і тыпалагічнага падабенства моў. Спосабы сістэматызацыі моў паводле падабенства (моўная сям'я, моўны саюз, моўны тып). Лінгвістычныя ўніверсаліі, метады іх выяўлення. Прынцыпы сістэматызацыі ўніверсалій у мовах свету (індуктыўныя і дэдуктыўныя, абсалютныя і статыстычныя, простыя і імплікацыйныя і інш.).

Фанетыка-фаналагічная і прасадычная тыпалогія моў (складовыя і фанемныя мовы, вакалічныя і кансанантныя мовы, танічныя і атанальныя мовы). Марфалагічная тыпалогія моў (аналітычныя, сінтэтычныя, інкарпаруючыя мовы). Аглюцінацыя і фузія як два тыпы марфалагічнай арганізацыі слова.

## Раздзел IV. Сацыяльная лінгвістыка і пісьмо

### *Тэма 12. Сацыяльная лінгвістыка*

Прадмет і задачы сацыяльнай лінгвістыкі. Метады сацыялінгвістыкі (назіранне, вуснае інтэрв'ю, анкетаванне, тэст).

Формы існавання агульнанароднай (этнічнай, ці нацыянальнай) мовы: тэрытарыяльныя (дыялекты), сацыяльныя (сацыялекты) і функцыянальныя (стылі літаратурнай мовы) варыянты. Літаратурная мова і яе нарматыўна-стылістычная сістэма. Узус. Кадыфікацыя літаратурнай мовы. Рэлігія ў сацыяльнай гісторыі моў.

Суадносіны этнічных і палітычных меж з арэаламі моў. Моўная самаідэнтыфікацыя індывіда і соцыуму. Суадносіны мовы і дыялекту. Моўная палітыка, яе аб'екты і суб'екты, мэты і метады. Юрыдычная рэгламентацыя моўнай палітыкі.

Моўная сітуацыя (маналінгвізм, білінгвізм, дыгласія), яе залежнасць ад сацыяльных і культурных фактараў. Масавы (этнічны) і індывідуальны (культурны) білінгвізм. Мовы міжэтнічных зносін. Мовы-пасрэднікі (лінгва франка, кайнэ, піджын). Крэалізацыя піджынаў і крэольскія мовы. Сусветныя і міжнародныя мовы. Рэгіянальныя і мясцовыя мовы. Вучэбна-педагагічны статус мовы (мова навучання, мова прадмета, мова выкладання, замежная мова, класічная мова). Канфесіянальны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

статус мовы. Штучныя мовы (створаныя на ўзор натуральных моў і інфармацыйныя мовы).

### *Тэма 13. Пісьмо. Графіка і арфаграфія*

Пісьмо як форма (разам з гукавой) існавання мовы. Значэнне пісьма ў гісторыі грамадства. Асноўныя этапы развіцця пісьма. Алфавіт, прынцып яго пабудовы. Суадносіны гука і літары. Паняцце аб графеме. Графіка. Крыніцы сімвалаў для графікі. Дыграфы, трыграфы і паліграфы. Надрадковыя знакі, інвертаванне і інверсія літар. Спецыяльныя віды пісьма, іх задачы і прынцыпы. Транскрыпцыя, транслітэрацыя.

Арфаграфія як сістэма правілаў перадачы вуснай мовы на пісьме. Арфаграфія як моўная праблема. Прынцыпы арфаграфіі. Арфаграфічная рэформа.

## Раздзел V. Дыяхранічная лінгвістыка

### *Тэма 14. Дыяхранічная лінгвістыка*

Зменлівасць мовы. Апазіцыя сінхраніі і дыяхраніі. Структура дыяхранічнай лінгвістыкі. Параўнальна-гістарычнае мовазнаўства і яго асноўныя паняцці: роднасць моў, гукавыя адпаведнасці («гукавыя законы»), прамова, моўная сям'я, рэканструкцыя форм, унутраная рэканструкцыя, генеалагічная класіфікацыя моў. Перадумовы моўнай зменлівасці: варыятыўнасць маўленчых рэалізацый структуры мовы, моўны кантакт і моўныя ўплывы, моўныя антыноміі, сацыяльна-гістарычныя і псіхалагічныя фактары, эканомія маўленчых высілкаў, канвенцыі.

Утварэнне моў і дыялектаў як вынік этнічных міграцый і дывергентна-канвергентных працэсаў. Мадэлі «генеалагічнага дрэва» і «тэорыі хваль» у мовазнаўстве XIX ст. Тэорыі субстрата і суперстрата. Інтэрферэнцыя як пачатак змешвання моў. Запазычанне. Моўны саюз як вынік канвергенцыі суседніх моў. Тэмпы моўных змен. Праблема ацэнкі «дасканаласці» мовы. Пытанне аб свядомым уздзеянні індывіда і соцыуму на мову.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

1. Беларуская мова : энцыклапедыя / пад рэд. А. Я. Міхневіча. – Мінск : Беларус. энцыкл. імя П. Броўкі, 1994. – 655 с.

2. *Гуліцкая, В. А.* Уводзіны ў мовазнаўства : дапаможнік для студэнтаў / В. А. Гуліцкая. – Мінск : БУК, 1998. – 63 с.

3. *Плотнікаў, Б. А.* Агульнае мовазнаўства : вучэб. дапам. / Б. А. Плотнікаў. – Мінск : Універсітэцкае, 1994. – 350 с.

4. *Рагаўцоў, В. І.* Уводзіны ў мовазнаўства : вучэб. дапам. / В. І. Рагаўцоў. – Магілёў : МДУ, 2004. – 397 с.

5. *Рагаўцоў, В. І.* Уводзіны ў мовазнаўства : практыкум / В. І. Рагаўцоў. – Магілёў: МДУ, 2003. – 126 с.

6. *Рагаўцоў, В. І.* Гісторыя мовазнаўства : вучэб. дапам. / В. І. Рагаўцоў. – Магілёў : МДУ, 2005. – 495 с.

7. *Рагаўцоў, В. І.* Практыкум па гісторыі агульнага мовазнаўства : дапаможнік для студэнтаў / В. І. Рагаўцоў. – Мінск : Універсітэцкае, 2001. – 183 с.

8. *Рагаўцоў, В. І.* Агульнае мовазнаўства : вучэб. дапам. / В. І. Рагаўцоў. – Магілёў : МДУ, 2006. – 412 с.

9. *Рагаўцоў, В. І.* Агульнае мовазнаўства : практыкум : вучэб. дапам. / В. І. Рагаўцоў. – Магілёў: МДУ, 2007. – 222 с.

10. *Рагаўцоў, В. І.* Уводзіны ў мовазнаўства : вучэб. дапам. / В. І. Рагаўцоў, А. Л. Юрэвіч ; пад рэд. К. У. Скурата. – Мінск : Выш. шк., 1987. – 205 с.

11. *Сцяцко, П. У.* Пачатковы курс мовазнаўства : навуч. дапам. / П. У. Сцяцко. – Гродна : ГрДУ, 1993. – 63 с.

12. *Сцяцко, П. У.* Уводзіны ў мовазнаўства : дапаможнік для студэнтаў / П. У. Сцяцко. – Гродна : ГрДУ, 2001. – 228 с.

13. Слоўнік лінгвістычных тэрмінаў / П. У. Сцяцко, М. Ф. Гуліцкі, Л. А. Антанюк. – Мінск : Выш. шк., 1990. – 220 с.

14. *Юрэвіч, А. Л.* Слоўнік лінгвістычных тэрмінаў / А. Л. Юрэвіч. – Мінск : Выд-ва Мін-ва выш., сярэд. спец. і праф. адукацыі БССР, 1962. – 246 с.

15. Słownik terminologii lingwistycznej (białorusko-rosyjsko-polski i polsko-rosyjsko-białoruski) / Skład. : E. Jurowiec, J. F. Nosowicz, L. Panfiluk, P. Stecko ; Zakład filologii wschoniosłowiańskej filii w Białymstoku. – Białystok : Wydawnictwo Agencji ER, 1994. – 162 s.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*16. Ахманова, О. С.* Словарь лингвистических терминов / О. С. Ахманова. – М. : Сов. энцикл., 1966. – 607 с. ; 2-е изд. – УРСС : Едиториал УРСС, 2004. – 571 с.

17. Введение в языкознание : хрестоматия / сост.: Б. Ю. Норман, Н. А. Павленко ; под ред. А. Е. Супруна. – 2-е изд. – Минск : Выш. шк., 1984. – 365 с.

*18. Гируцкий, А. А.* Введение в языкознание : практикум / А. А. Гируцкий, Г. А. Камлевич ; под общ. ред. А. А. Гируцкого. – Минск : Асар, 2008. – 287 с.

*19. Гируцкий, А. А.* Общее языкознание: практикум / А. А. Гируцкий, Г. А. Камлевич ; под общ. ред. А. А. Гируцкого. – Минск : Асар, 2008. – 271 с.

*20. Гируцкий, А. А.* Введение в языкознание : учеб. пособие / А. А. Гируцкий. – Минск : ТетраСистемс, 2001. – 287 с. ; 2-е изд. – 2003. – 286 с. ; 3-е изд. – 2005. – 285 с.

*21. Гируцкий, А. А.* Общее языкознание : пособие для студентов / А. А. Гируцкий. – 4-е изд. – Минск: ТетраСистемс, 2008. – 318 с.

*22. Косовский, Б. И.* Общее языкознание : Учение о слове и словарном составе языка / Б. И. Косовский. – Минск : Выш. шк., 1974. – 270 с.

23. Краткий словарь лингвистических терминов / Н. В. Васильева, В. А. Виноградов, А. М. Шахнарович. – М. : Русский язык, 1995. – 176 с.

24. Краткий словарь лингвистических терминов : учеб. пособие / сост. Л. В. Варпахович. – Минск : МГЛУ, 1996. – 53 с.

*25. Лебедева, И. Г.* Введение в языкознание : учеб.-метод. комплекс / И.Г. Лебедева. – Новополоцк : ПГУ, 2010. – 350 с.

26. Лингвистический энциклопедический словарь / гл. ред. В. Н. Ярцева. – М. : Сов. энцикл., 1990. – 682 с.

*27. Маслов, Ю. С.* Введение в языкознание : учебник / Ю. С. Маслов. – 3-е изд. – М. : Высш. шк., 1998. – 272 с. ; 4-е изд. – М. : Академия ; СПб. : СПбГУ, 2005. – 300 с.

*28. Мечковская, Н. Б.* Общее языкознание : Структурная и социальная типология языков / Н. Б. Мечковская. – Минск : Амалфея, 2000. – 368 с.

*29. Норман, Б. Ю.* Основы языкознания / Б. Ю. Норман. – Минск : Белорус. Фонд Сороса, 1996. – 207 с.

*30. Норман, Б. Ю.* Теория языка : Вводный курс : учеб. пособие / Б. Ю. Норман. – М. : Флинта : Наука, 2004. – 296 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

31. Общее языкознание : Структура языка : Типология языков и лингвистика универсалий : учеб. пособие / Н. Б. Мечковская, Б. Ю. Норман, Б. А. Плотников, А. Е. Супрун ; под общ. ред. А. Е. Супруна. – 2-е изд. – Минск : Выш. шк., 1995. – 336 с.

32. Общее языкознание : Сущность и история языка : учеб. пособие / Н. Б. Мечковская, Б. А. Плотников, А. Е. Супрун ; под общ. ред. А. Е. Супруна. – 2-е изд. – Минск : Выш. шк., 1993. – 287 с.

33. Общее языкознание : хрестоматия / сост.: Б. И. Косовский, Н. А. Павленко ; под общ. ред. А. Е. Супруна. – 2-е изд. – Минск : Выш. шк., 1987. – 414 с.

*34. Реформатский, А. А.* Введение в языковедение : учебник / А. А. Реформатский ; под ред. В. А. Виноградова. – 5-е изд. – М. : Аспект-Пресс, 2004; 2005; 2007; 2009. – 536 с.

*35. Роголев, А. Ф.* Введение в языкознание : курс лекций / А. Ф. Роголев. – Гомель : ГГУ, 2003. – 269 с.

36. Русско-белорусский словарь лингвистических терминов / сост.: Л. А. Антонюк, П. В. Стецко ; ред. Н. В. Бирилло, П. В. Стецко. – Минск : Наука и техника, 1988. – 140 с.

*Дадатковая*

*1. Абабурка, М. В.* Беларускае слова і яго вывучэнне / М. В. Абабурка. – Мінск : Выш. шк., 1986. – 127 с.

*2. Абабурка, М. В.* Лінгвістыка тэксту : дапаможнік / М. В. Абабурка. – Магілёў : МДУ, 2008. – 139 с.

*3. Аксамітаў, А. С.* Беларуская фразеалогія / А. С. Аксамітаў. – Мінск : Выш. шк., 1978. – 223 с.

*4. Брэтон, Ф.* Выбух камунікацыі : Нараджэнне новай ідэалогіі / Ф. Брэтон, С. Пру. – Мінск : Беларус. Фонд Сораса, 1995. – 334 с.

*5. Выгонная, Л. Ц.* Інтанацыя. Націск. Арфаэпія / Л. Ц. Выгонная. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991. – 215 с.

*6. Крывіцкі, А. А.* Фанетыка беларускай мовы : вучэб. дапам. / А. А. Крывіцкі, А. І. Падлужны. – Мінск : Выш. шк., 1984. – 269 с.

7. Лексікалогія сучаснай беларускай мовы / пад рэд. А. Я. Баханькова. – Мінск : Навука і тэхніка, 1994. – 463 с.

*8. Мікуліч, Т. М.* Мова і этнічная самасвядомасць / навук. рэд. В. К. Бандарчык. – Мінск : Навука і тэхніка, 1996. – 159 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*9. Плотнікаў, Б. А.* Фанетыка і марфалогія беларускай мовы / Б. А. Плотнікаў. – Мінск : Акад. кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, 2000. – 116 с.

*10. Рагаўцоў, В. І.* Мовы свету : энцыкл. даведнік / В. І. Рагаўцоў. – Магілёў : МДУ, 2009. – 287 с.

*11. Шакун, Л. М.* Словаўтварэнне / Л. М. Шакун. – Мінск : Выш. шк., 1978. – 128 с.

*12. Шуба, П. П.* Уводзіны ў граматыку беларускай мовы / П. П. Шуба. – Мінск : Выд-ва БДУ, 1969. – 63 с.

*13. Янкоўскі, Ф. М.* Беларуская фразеалогія / Ф. М. Янкоўскі. – Мінск : Нар. асвета, 1981. – 79 с.

*14. Норман, Б. Ю.* Язык : Знакомый незнакомец / Б. Ю. Норман. – Минск : Выш. шк., 1987. – 222 с.

15. Методы изучения лексики / под ред. А. Е. Супруна. – Минск : Изд-во БГУ, 1975. – 232 с.

*16. Мечковская, Н. Б.* Социальная лингвистика : пособие для студентов / Н. Б. Мечковская. – 2-е изд., испр. – М. : Аспект-Пресс, 2000. – 206 с.

*17. Павленко, Н. А.* История письма : учеб. пособие / Н. А. Павленко. – 2-е изд. – Минск : Выш. шк., 1987. – 236 с.

*18. Плотников, Б. А.* О форме и содержании в языке / Б. А. Плотников. – Минск : Выш. шк., 1989. – 252 с.

*19. Плотников, Б. А.* Основы семасиологии / Б. А. Плотников. – Минск : Выш. шк., 1984. – 220 с.

## Пытанні для самакантролю

1. Прадмет і задачы навукі аб мове. Месца мовазнаўства ў сістэме лінгвістычных дысцыплін.

2. Камунікацыя. Тэкст. База ведаў для камунікацыі. Фонавыя веды (прэсупазіцыі). Імплікатуры.

3. Суадносіны мовы і маўлення. Функцыі мовы і маўлення. Камунікацыя людзей і жывёл: падабенства і адрозненне.

4. Суадносіны мовы і мыслення. Моўная карціна свету і тэорыя лінгвістычнага рэлятывізму.

5. Суадносіны мовы і культуры. Лексічныя лакуны і безэквівалентная лексіка. Эўфемізмы і табу.

6. Знак, два яго планы; асноўныя ўласцівасці моўнага знака. Кампаненты семіёзісу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

7. Тыпалогія знакаў (іконы, індэксы, сімвалы), субзнакі (дыстынктары і дэлімінатары).

8. Моўныя адзінкі і ўзроўні, адносіны паміж моўнымі адзінкамі. Моўная сістэма.

9. Тэорыя маўленчых актаў (лакуцыя, ілакуцыя, перлакуцыя), перфарматыў.

10. Асноўныя паняцці акустыкі. Моўны апарат і яго будова. Артыкуляцыя і яе фазы. Дадатковая артыкуляцыя.

11. Асноўныя акустычныя і артыкуляцыйныя класіфікацыі гукаў.

12. Фанема і алафоны; прыкметы фанем; апазіцыі фанем. Дыстрыбуцыя і змены гукаў.

13. Сістэма фанем, моцныя і слабыя пазіцыі; нейтралізацыя фанем; гіперфанема.

14. Фанетычныя працэсы ў моўнай плыні.

15. Фанетычны падзел моўнай плыні, прасадычныя з’явы.

16. Марфема, яе асноўныя ўласцівасці і аламорфы. Тыпы марфем.

17. Дэрывацыйны аналіз, яго асноўныя паняцці.

18. Слова як адзінка мовы, лексічнае значэнне. Імёны і тэрміны. Анамастыка.

19. Намінацыя. Унутраная форма слова. Этымалогія слова, дээтымалагізацыя.

20. Лексічная сістэма мовы. Канцэпты і ментальны лексікон. Аб’ём слоўніка мовы.

21. Полісемія, яе адрозненне ад аманіміі. Кантэкст. Тыпы лексічных значэнняў шматзначнага слова. Перанос значэнняў.

22. Лексіка-семантычныя групоўкі слоў.

23. Сацыяльна-тэрытарыяльная класіфікацыя лексікі.

24. Класіфікацыя лексікі паводле паходжання. Калькі. Пурызм.

25. Класіфікацыя лексікі паводле частаты ўжытку і хparty храналагічных суадносін. Аказіяналізмы.

26. Стылявая класіфікацыя лексікі. Аб’ём слоўніка мовы і індывіда.

27. Фразеалагізмы, іх класіфікацыя. Афарызмы і крылатыя выразы. Крытэрыі фразеалагічнасці і класіфікацыя фразеалагізмаў.

28. Практычная і тэарэтычная лексікаграфія, іх задачы. Тыпы слоўнікаў. Структура слоўніка і слоўнікавага артыкула.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

29. Граматычнае значэнне і спосабы яго выражэння. Граматычная форма. Парадыгма, яе тыпы.

30. Граматычная катэгорыя, яе тыпы. Тыпы граматычных катэгорый у розных мовах. Прынцыпы катэгарызацыі, прататыпы.

31. Марфалагічная тыпалогія моў.

32. Часціны мовы і прынцыпы іх вылучэння ды размежавання. Транспазіцыя.

33. Сінтаксічная функцыя, сувязь, яе тыпы, сінтаксічнае значэнне. Асноўныя тыпы сінтаксічных сувязяў у мовах свету.

34. Словазлучэнне і яго віды. Свабодныя і несвабодныя словазлучэнні.

35. Сказ, яго структура і кампаненты. Прэдыкатыўнасць. Паратаксіс і гіпатаксіс. Тэма і рэма.

36. Вербацэнтрычныя канцэпцыі сказа. Сінтаксічная валентнасць.

37. Пісьмо як адна з форм існавання мовы. Асноўныя этапы развіцця пісьма. Алфавіт.

38. Графіка. Суадносіны гука і літары. Арфаграфія і яе прынцыпы. Спецыяльныя віды пісьма.

39. Формы існавання мовы ў грамадстве (дыялект, літаратурная мова, жаргоны), іх суадносіны.

40. Моўная сітуацыя і яе тыпы, моўная палітыка. Культура мовы.

41. Білінгвізм і дыгласія, інтэрферэнцыя, мяшанне і гібрыдызацыя моў. Піджыны і крэолы.

42. Мовы шырокай камунікацыі. Штучныя мовы, класічныя і мёртвыя мовы, адраджэнне мовы.

43. Моўная норма і нарматыў. Літаратурная мова, яе ўласцівасці. Арфаэпія. Функцыянальныя стылі мовы.

44. Прынцыпы класіфікацыі моў, генеалагічная і тыпалагічная класіфікацыя моў. Моўныя ўніверсаліі.

45. Сінхранія і дыяхранія. Моўная эвалюцыя і яе асноўныя паняцці. Прамова (мова-аснова). Этнічная мова.

46. Прычыны і характар змен у мове. Моўныя законы.

47. Традыцыйныя і найноўшыя метады вывучэння мовы.

48. Параўнальна-гістарычнае мовазнаўства: метады, дасягненні.

49. Структурнае мовазнаўства (дыскрыптывістыка): метады, школы, дасягненні.

50. Арэальная і кантактная лінгвістыка, этна- і псіхалінгвістыка, генератыўная лінгвістыка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**АГУЛЬНАЕ МОВАЗНАЎСТВА**

*Вучэбная праграма*
*па спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (па напрамках), напрамку спецыяльнасці 1-23 01 11-04 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (філалогія і лінгвістыка), спецыялізацыі 1-23 01 11-04 01 Беларуская мова і літаратура*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар А. У. Гіцкая

Падпісана ў друк 2013. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,16. Ул.-выд. арк. 0,79. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
ЛИ № 02330/0003939 ад 19.05.2011.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ